■ Інфарм-укол

# ГАРЭЛКА ЯК ЕЖА?

**Аб тым, што рабіць з высакаградусным злом, разважае ўрач псіхіятр-нарколаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Ігар ЮРГЕНС**

**Пакуль палову харчовых магазінаў займаюць алкагольныя напоі, пакуль людзі працягваюць харчавацца гарэлкай з півам, нашы праблемы, звязаныя са злоўжываннем алкаголем, нікуды не знікнуць. Гэты фактар будзе важкім у структуры агульнай смяротнасці, нізкай вытворчасці працы, у парушэнні правапарадку, разводах, пазбаўленні бацькоўскіх правоў, дарожна-транспартных здарэннях, росце захворванняў, ранней інваліднасці.**

Проста задумайцеся: «адкачаць» аднаго алкаша ў рэанімацыі абыходзіцца ў тысячу долараў за суткі. Пры гэтым, калі ён стане інвалідам у актыўным узросце, дзяржава будзе яшчэ дадаткова плаціць яму пенсію звыш тысячы долараў за год плюс лекі на немалую суму. А такіх людзей тысячы!

Маштабы п'янства закранаюць кожную другую сям'ю ў нашай краіне. Ужо фактычна кожны выпускнік школы мае добры вопыт ужывання алкаголю. П'янства стала часткай жыцця! Паводле некаторых падлікаў, звычайны пітушчы чалавек траціць на спіртное столькі ж, колькі на мяса або бензін, або ў 10 разоў больш, чым на садавіну, у 7 разоў больш, чым на вопратку...

Меры па барацьбе з п'янствам добра вядомыя. Неабходна звярнуць увагу на некалькі момантаў. Першы — даступнасць. Алкагольныя напоі, па прыкладзе многіх развітых краін, неабходна прадаваць толькі ў спецыялізаваных крамах. Другі момант — прапаганда здаровага ладу жыцця павінна стаць значна больш актыўнай. Сцэнгазеты ў паліклініцы недастаткова. Неабходна як мага больш шырока гаварыць аб шкодзе алкаголю і ўкараняць у грамадскай думцы непапулярнасць алкагольных паводзін, непрыняцце пітушчых людзей. Варта адначасова больш рэкламаваць фізкультурна-аздараўленчыя комплексы.

Неабходна звярнуць увагу і на злоўжыванне бясплатнай медыцынай. Кожны з нас абавязаны клапаціцца пра ўласнае здароўе і адначасова разумець, што за здароўе трэба плаціць. Наш пітушчы чалавек ведае, што дзяржава аплаціць і лячэнне, і рэабілітацыю, а гэта зусім не капейкі. Калі ўлічыць, што сярэдняя сям'я траціць на алкаголь 5-15 працэнтаў сваіх даходаў, можна падумаць аб укараненні ў практыку элементаў платнай медыцыны. Размова ідзе аб прымальных сумах — на аплату самых элементарных аналізаў, абследаванне і кансультацыю. Гэта па сілах любому. Калі паглядзець у цэлым на нашу ахову здароўя, то акажацца, што яна толькі і займаецца, што лячэннем алкагалізму — больш як палова стацыянарных хворых у працаздольным узросце маюць праблемы з алкаголем.

Неабходна таксама павышаць цэны на алкаголь. Чалавек больш патраціць, але менш вып'е. А той, хто выпівае ўмерана, задумаецца, ці варта выпіваць наогул ці будзе рабіць гэта па мінімуме. Паралельна дзяржава павінна ўвесці важкія штрафы за самагонаварэнне. Ажыццяўляць такія змены неабходна паступова — паколькі наша грамадства цяжка перажывае хуткія і радыкальныя крокі, — але настойліва.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.32 | 17.15 | 8.43 |
| Віцебск — | 8.27 | 17.03 | 8.36 |
| Магілёў — | 8.22 | 17.05 | 8.43 |
| Гомель — | 8.13 | 17.07 | 8.54 |
| Гродна — | 8.46 | 17.31 | 8.45 |
| Брэст — | 8.41 | 17.37 | 8.56 |

## Месяц

*Маладзік 11 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Аляксея, Анатоля, Івана, Сяргея, Усевалада.*
**К.** *Валянціны, Станіславы, Хрысціны, Аркадзя, Мікалая.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**13 ЛІСТАПАДА**

**1806** год — нарадзілася Эмілія Плятэр, беларуская фальклярыстка, удзельніца паўстання 1830-1831 гадоў. Збірала і апрацоўвала беларускія народныя песні, пісала вершы. У 1831 годзе ўзначаліла паўстанне ў мястэчку Дусетас (цяпер тэрыторыя Літвы), арганізавала партызанскі атрад, які ў чэрвені пасля шматлікіх баёў уліўся ў рэгулярнае войска. Уключана ў яго штаб, прызначана ганаровым камандзірам роты і атрымала званне капітана. Памерла ў 1831 годзе ад ран. Пра яе напісаны вершы паэтамі розных краін Еўропы, у тым ліку Адамам Міцкевічам. Імя Эміліі Плятэр насіў асобы жаночы батальён 1-й пяхотнай дывізіі імя Т. Касцюшкі Войска Польскага, сфарміраваны ў 1943 годзе ў СССР.



**1821** год — нарадзіўся Міхаіл Петрашэўскі, рускі мысляр, рэвалюцыянер. З 1845 года ў доме Петрашэўскага праходзілі так званыя «пятніцы» — таемныя сходы, на якіх абмяркоўваліся рэвалюцыйныя ідэі, матэрыялістычная філасофія і ўтапічны сацыялізм. Коратка погляды Петрашэўскага можна ахарактарызаваць так: свабоду і зямлю — сялянам, дэмакратыю — Расіі. На працягу чатырох гадоў Петрашэўскі актыўна прымаў удзел у жыцці тайнай супольнасці, якая рыхтавала народ да рэвалюцыі. Аднак у 1849-м паліцыя выйшла на след і арыштавала Петрашэўскага і яго паслядоўнікаў. Яны былі асуджаны да расстрэлу. Смяротнае пакаранне было па-майстэрску інсцэніравана і толькі за імгненне да выстралу асуджаным абвясцілі аб памілаванні і замене пакарання катаргай. Петрашэўскі быў сасланы ва Усходнюю Сібір. Будучы ў ссылцы, ён жыў у Іркуцку, дзе заснаваў газету «Амур» і змагаўся з самаўпраўствам мясцовых улад. За што быў яшчэ раз сасланы — на гэты раз у сяло Шушанскае. Затым жыў у Краснаярску, але не прыжыўся, і за свае погляды яго зноў выселілі ў Шушанскае. У 1866 годзе рэвалюцыянер Міхаіл Васільевіч Петрашэўскі пасяліўся ў Енісейскай акрузе, дзе ён і памёр 19 снежня таго ж года.

**1850** год — нарадзіўся Роберт Льюіс Стывенсан, вядомы шатландскі пісьменнік і паэт. Першая кніга «Пентландскае паўстанне» была напісана ў 1866 годзе. Пасля заканчэння ўніверсітэта Стывенсан пасяляецца ў Францыі, падарожнічае па Еўропе і Амерыцы, бывае ў Германіі, Швейцарыі, Англіі. Стывенсан пісаў у жанры гісторыка-прыгодніцкага рамана. Самы вядомы яго твор — «Востраў скарбаў» — быў напісаны ў 1883 годзе і ўжо праз тры гады перакладзены на рускую мову. Сярод астатніх твораў пісьменніка варта адзначыць «Прынц Ота», «Чорная страла», «Уладальнік Балантрэ». Некалькі кніг пісьменнік выпусціў сумесна са сваім пасынкам Лойдам Осбарнам («Пацярпелыя караблекрушэнне») і са сваёй жонкай Франсес Стывенсан («Яшчэ раз Новыя Арабскія ночы»). Раман «Пацярпелыя караблекрушэнне» стаў любімым творам Хорхе Борхеса. Асабліва папулярныя кнігі Стывенсана аб прыгодах прынца Фларызеля, а таксама псіхалагічная аповесць «Дзіўная гісторыя доктара Джэкіла і містара Хайда». У 40 гадоў Стывенсан пасяліўся на астравах Самоа, дзе і памёр праз чатыры гады — 3 снежня 1894-га.

Было сказана

**Алесь БАЧЫЛА, паэт:**
*Дуб і той, калі ў полі адзін,*
*Не заўсёды адольвае буру.*

## УСМІХНЕМСЯ

— Рыгор, вазьмі дзіця на футбол!
— Навошта? Ён яшчэ маленькі.
— А чаго яму гарлапаніць проста так?

**Падчас раз'юшаных спрэчак у інтэрнэце ніколі не дакарайце суразмоўцу за яго граматычныя памылкі, бо, магчыма, яго клас гэтую тэму яшчэ не праходзіў.**

— Выйдзеш за мяне замуж?
— Мужчына, за якога я выйду, павінен быць адважны і кемлівы!
— А ты ўжо не памятаеш, як я выратаваў цябе, калі ты танула?
— Ну так, ты адважны, але гэта яшчэ не значыць, што ты кемлівы.
— А як ты думаеш, хто лодку перакуліў?..




■ Будзь у курсе!

# ВАЗЬМУ Я КЛЮШКУ Ў САМАЛЁТ...

**Авіякампанія «Белавія» ўключыла спартінвентар у бясплатную норму правозу багажу, змяніўшы правілы яго правозу.**

Адзін камплект спартыўнага рыштунку перавозіцца без дадатковай аплаты, калі сумарная вага яго і іншага багажу не перавышае норму бясплатнага правозу ў адпаведным класе абслугоўвання.

У выпадку, калі сумарная вага багажу (вага спартыўнага рыштунку і іншага багажу) перавышае норму бясплатнага правозу ў адпаведным класе абслугоўвання, бярэцца аплата за кожны кілаграм перавышэння па стаўках у залежнасці ад маршруту руху пасажыраў.

Спартыўны рыштунак звыш аднаго камплекта, жывёлы (вага разам з кантэйнерам) і зброя (спартыўная/паляўнічая/баявая плюс боепрыпасы) не ўваходзяць у норму бясплатнага правозу багажу і дадаткова аплачваюцца па стаўках за кожны кілаграм.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4498.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 лістапада 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12